Па–беларуску ж выступіў і „Польскі Цэнтар“ — № 12. Гэтыя паны ўжо нават і зямлі ня суляць, а толькі зьбіраюцца даходзіць „аблягчэньня пазычкі зямельнай“, каб народ гэтай пазычкай закабаліць на дзясяткі гадоў, абярнуць у нявольнікаў, што ўсе плады сваей працы павінны будуць аддаваць у панскія кішані!

Далей ідзе хаўрузія польскіх паноў–абшарнікаў з нашага краю, якія, узіраючыся на маскалёў, навет імя нашае зямлі выкінулі з ужытку ды назвалі яго „крэсамі“. Называецца гэтая хаўрузія „Дзяржаўнае Зьеднагэньне на Крэсах“ і мае нумар 22. І гэтыя паны, забыўшыся нашае імя, усё ж пішуць свае адозвы па–беларуску...

Урэшце, не давяраючы павазе свайго імя, хоць і прыбранага ў беларускія словы, паны ўзялі да сябе на службу хэўру нягоднікаў, што запэцкалі свае рукі крывёй бязьвінна забіваных імі людзей, ды, на вялікі жаль, паходзяць з нашага ж беларускага народу. Гэтыя вырадкі, даўно ўтраціўшыя сваё сумленьне, выступаюць цяпер на абарону паноў як беларусы; на чале іх стаіць вядомы пагромшчык „бацька“ Балаховіч, што рубіць цяпер Белавескую пушчу і гэтак памагае рабаваць наш край. Сюды ж належыць і банда „зялёнадубцаў“, каторыя з рэвальверамі ў руках урываюцца на беларускія зьезды і стараюцца гвалтам перашкодзіць народу выбраць у Сойм запраўдных народных абаронцаў. Урэшце, дзеля паноў працуюць і так званыя „актывісты“, якія разам зь „зялёнадубцамі“ агітуюць за польскія сьпіскі — „22“ і „2“.

А ведаеце, які той № 2? Гэта ППС — „Польская Партыя Сацыялістаў“. У добрую хаўрузію папалі польскія сацыялісты „на крэсах“!

Мы тут пералічылі ўсіх тых ваўкоў, што падшываюцца пад беларускае імя і сваімі беларускімі адозвамі хочуць абаламуціць наш народ. Ясна, што за гэтых падшывальцаў ніводзін беларус не павінен даць свайго голасу.

Ясна таксама, што нам больш не па дарозе з тымі польскімі партыямі, якія навет на час выбараў ня хочуць загаварыць „па–хамску“. Ясна, што за такія партыі галасаваць мог бы толькі той, хто зусім утраціў розум ці прадаў сумленьне.

Адзіны сьпісак, дзе ёсьць запраўдныя сыны беларускага народу — сыны мужыкоў–хлебаробаў, гэта сьпісак № 16. І кожын беларус павінен даць свой голас за № 16, калі хоча лепшае долі сабе і сваім дзецям.

## „Вызваленцы“ скінулі маску!

Толькі ў апошні мамэнт перад выбарамі „вызваленцы“ скінулі маску, у якой дагэтуль хадзілі.

Яшчэ так нядаўна яны завяралі і ў Сойме, і ў сваіх газэтах, што толькі яны адны спаміж польскіх партыяў стаяць за волю для ўсіх няпольскіх нацыяў у межах Польскага Гаспадарства.

Тады добры быў для іх і беларус, і ўкраінец, і жыд.

Цяпер яны запяялі новую песьню. Цяпер яны афіцыяльна прызналіся, што яны — такія ж ворагі „інародцаў“, такія ж „жыдаеды“, як і ідэйныя хаўрусьнікі іх — пагромшчык Балаховіч, бандыты–зялёнадубцы і звычайныя жулікі ды зладзеі „актывісты“.

„Вызваленьне“ надрукавала надовячы адозву аб тым, за каго *ня трэба* галасаваць. У гэтай адозьве аб польскіх панскіх і эндэцкіх партыях сказана нешта вельмі туманнае ў трох радкох. Затое на дзьвюх страніцах ідзе нягодная брахня і лаянка на № 16 — зусім у духу пагромшчыкаў. Чытаючы яе, так і чакаеш, што яна закончыцца клічам: „бей жыдоў, спасай Польшчу!“ „Вызваленцы“ ўрэшце зусім адкрыта далучылі свой голас да згоднага хору ўсіх польскіх партыяў!

На ўсю іх брахню ня будзем адказваць: сьмешна чытаць, як сын абшарніка і сам уласьнік вялізарнае друкарні ў Вільні Хамінскі[1] і такі ж панок Ваяводзкі лгуць, быццам сялянскі сын

зь вёскі Кабыльле Вялейскага п. Аўсянік, сям'я якога сядзіць на сваім вузкім надзеле, „мае фальварак у Валожынскім павеце“. Лгуць, не чырванеючы, быццам Хамінскі нічога супольнага зь зямлёй ня мае, быццам зямлю маюць яго „крэўныя“, якія яго выракліся! Дык жа гэныя „крэўныя“ — ягоны родны бацька, і пан Хамінскі ў Сойме ўжо здалее абараніць сваю спадчыну па бацьку!

Дый ня ў гэтым толькі справа. „Вызваленьне“ ведае, што беларускія паслы могуць папасьці ў Сойм толькі па сьпіску № 16, дзе яны займаюць першыя месцы. На сьпісках „вызваленскіх“ наперадзе стаяць польскія панкі — быўшыя агенты другога аддзелу[2], і вось іх–та маюць правадзіць беларусы сваімі галасамі! А беларусаў у Сойме — зусім ня трэба!

Праўда, ёсьць і „беларускі“ сьпісак, каторага „Вызваленьне“ ня лаець, ды ён беларускі толькі па іменьню. Гэта — сьпісак № 24, сьпісак „зялёнадубцаў“, „балахоўцаў“ і „актывістаў“, запрадаўшыхся польскім панам. Вось проці іх „Вызваленьне“ ніводным словам не выступае. Гэта для яго — ідэйныя таварышы. З гэтымі бандытамі „вызваленцы“ салідарна, быццам змовіўшыся, стараюцца разьбіць сьпісак 16.

Ды дарма, панове! Народ ужо пазнаў вас! Народ ведае, што тыя вялізарныя грошы, якімі вы закідаеце нашу вёску, ня могуць ісьці з чыстае крыніцы! Апошняя ж ваша адозва расчыніць вочы і тым, хто дагэтуль яшчэ вам верыў.

Сягоньня вы цкуяцё народ на жыдоў. Заўтра будзеце цкаваць Сойм — на беларусаў!

## Наша пабеда

Нягледзячы на ўсе перашкоды, нягледзячы на крыўдны для нас выбарны закон, нягледзячы на тэрор адміністрацыі і нялічаныя гвалты, *беларусы адваявалі сабе месца ў Сойме.*

Паводле нашых аблічэньняў, па сьпісках № 16 у Сойм прайшло *дванаццаць беларусаў*. Дый гэта — ня ўсё: бо некалькі беларусаў прайшло такжа па сьпісках „Вызваленьня“[1]. Гэтак, у варшаўскім Сойме ўсяго беларусаў будзе *каля дваццацёх*.

Не прыходзіцца даводзіць, што гэта — *вялізарная пабеда*. Перад выбарамі палякі лічылі, што беларусаў у Сойме можа быць ня больш як 4—6 душ. Вынікі выбараў далі цыфру ў чатыры разы вялікшую. Дарма польскія нацыяналісты з правага і левага крыла ажно сіпяць на нас за гэта, дарма Обст у адчаі з гора піша аб „паражэньні беларусаў“ на тэй аснове, што за сьпісак банды „зялёнадубцаў“ у Вільні пададзена ўсяго 10 галасоў, — пабеды нашае нішто і ніхто зьмяніць ня можа. Яе пацьвярджае і прыведзены Обстам факт, што на ўсю Вільню знайшлося сярод беларусаў ня *больш дзесяцёх* здраднікаў, якія за грошы польскіх паноў згадзіліся адступіцца ад агульнабеларускага камітэту і аддалі свае галасы не за № 16!

Аглядаючыся на ўвесь ход выбарнае агітацыі варожых нам партыяў, якія на выбарах праваліліся, мы бачым яшчэ адзін доказ таго, што беларускі народ *сьвядома* йшоў да выбараў, што пабеда дасталася нам толькі дзякуючы высокаму разьвіцьцю ў нашых масах *нацыянальнае сьвядомасьці і нацыянальнага пачуцьця*. Праваліліся і „зялёнадубцы“, і „балахоўцы–пагромшчыкі“, праваліўся ўвесь сьпісак № 22, на чале якога стаяў „rodzony brat Naczelnika Państwa“[2], бо народ зразумеў, што за імі стаіць польскі пан–абшарнік зь бізуном, стаіць польскі каляніст, які цікуе на нашу зямліцу. Затое ж побач з № 16 у цэлым радзе беларускіх акругоў прыходзілі[3] кандыдаты „Вызваленьня“, якое ўвесь час агітавала па–беларуску, выпускала беларускія газэты і адозвы, заяўляючы нашаму сялянству, што ў сваей праграме „Вызваленьне“ стаўляе абарону нацыянальных патрэб беларускага народу, барацьбу проці польскае калянізацыі, абарону беларускае школы, дамаганьне аўтаноміі Заходняе Беларусі, забранае Польшчай. Усе гэтыя пункты былі даслоўна сьпісаны з выбарнае плятформы Беларускага Цэнтральнага Выбарнага Камітэту, і затым–та сяляне, ня ведаўшыя праўды аб сьпіску № 16, ахвотна галасавалі за „Вызваленьне“, думаючы, быц-